**С.В. Мартынкевіч**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
e-mail: svetlana_mrt@mail.ru

УДК 811.1613'242'38

# ВЫВУЧЭННЕ ЖАНРАЎ МАЎЛЕННЯ Ў ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ: КАМУНІКАТЫЎНА-ДЗЕЙНАСНЫ АСПЕКТ

*Ключавыя словы: камунікатыўныя ўменні, жанры маўлення, стылі маўлення, сітуацыя маўлення, тэкст.*

*У артыкуле раскрываюцца асаблівасці вывучэння жанраў маўлення ў курсе беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі; прыводзіцца пералік асноўных камунікатыўных уменняў, разглядаюцца заданні і прыклады камунікатыўных практыкаванняў, накіраваных на засваенне ведаў і фарміраванне ўменняў стварэння тэкстаў розных жанраў маўлення.*

На сучасным этапе развіцця лінгваметодыкі навукоўцы абгрунтавалі мэтазгоднасць вывучэння стыляў маўленняў у цеснай узаемасувязі з іх жанравай разнастайнасцю (Г.М. Валочка, В.Я. Гольдзін, Т.У. Ігнатовіч, Т.С. Кудраўцава, Г.І. Нікалаенка, Т.В. Шмялёва і інш.).

Прынцып жанрава-сылістычнай арыентацыі найбольш паслядоўна рэалізуе ідэі камунікатыўна-дзейнаснага навучання беларускай мове, бо фарміраванне маўленча-камунікатыўныхуменняў і ў цэлым развіццё маўлення вучняў немагчыма без базавых уменняў ствараць тэксты з пэўнай камунікатыўнай мэтай і ўлікам асаблівасцей маўленчай сітуацыі.

Спараджэнне выказвання "...адлюстроўвае шлях, па якім ідзе думка, што паступова фарміруецца ў свядомасці таго, хто гаворыць ці піша, і якая фарміруе ўласнае паведамленне ў яго моўным выражэнні" [3, с.161]. Таму веды пра будову тэкстаў розных жанравых формаў будуць садзейнічаць упарадкаванню выказвання, дакладнаму і дарэчнаму адбору моўных сродкаў. Пры гэтым варта адзначыць, што вучэбная праграма па беларускай мове дастаткова сціпла акрэслівае веды пра жанры маўлення. Таму, на нашу думку, прапанаваны змест варта пашырыць найбольш запатрабаванымі жанрамі, актуальнымі для розных сітуацый маўленчых зносін. Акрамя *гутаркі,* вызначанай праграмай для разгляду пры вывучэнні гутарковага стылю, вучням V і VI класаў мэтазгодна прапаноўваць стварэнне такіх выказванняў, як *сяброўскі ліст, sms-паведамленне, бытавая запіска*. Пры вывучэнні мастацкага стылю неабходна "...раскрыць сакрэт мастацкага тэксту, дзе звыклыя словы, якія даволі шырока выкарыстоўваюцца ў штодзённым маўленні, нечакана становяцца крыніцай незвычайна яркіх вобразаў" [1, с.19]. Таму разам з *апавяданнем* варта разглядаць асаблівасці стварэння *мастацкага апісання, усхваляльнага слова, загадкі. Лінгвістычнае паведамленне і рэцэнзаванне адказу* як даступныя для вучняў жанры навуковага стылю будуць садзейнічаць фарміраванню міждысцыплінарных уменняў і навыкаў, якія запатрабаваныя на працягу ўсяго навучання пры засваенні розных вучэбных прадметаў. Уменні напісання *аб'явы, біяграфіі і характарыстыкі* актуалізуюцца ў тыповых афіцыйных сітуацыях, дзе мэта вызначае жанр маўлення, таму ў змест навучання варта ўключыць матэрыял пра асаблівасці жанравых формаў названых афіцыйных тэкстаў. Звесткі пра *нататку,* вызначаныя маўленчай часткай вучэбнай праграмы, арганічна спалучаюцца з асаблівасцямі будовы *замалёўкі*ў публіцыстычным стылі. Пры гэтым увага павінна засяроджвацца на свядомым стаўленні да працэсу стварэння такіх тэкстаў, фарміраванні адказнасці да адбору моўных сродкаў у кожным асобным выпадку.

Такім чынам, арганічнай часткай маўленча-камунікатыўнага зместу навучання беларускай мовы ў 5 – 6 класах могуць стаць веды пра прыметы, разнавіднасці і асаблівасці наступных жанраў маўлення: *гутаркі, сяброўскага ліста, бытавой запіскі, sms-паведамлення* у гутарковым стылі; *апавядання, мастацкага апісання (замалёўкі), водгуку (выказвання ўражанняў), віншавання, загадкі, казкі, усхваляльнага слова*у мастацкім стылі; *навуковага (лінгвістычнага) паведамлення, водгуку наадказу* навуковым стылі; *аб'явы, заявы, аўтабіяграфіі, характарыстыкі* у афіцыйным стылі; *нататкі, рэпартажу, замалёўкі, інфармацыйнага паведамлення(публічнага выступлення)* у публіцыстычным стылі.

Базавыя веды пра асаблівасці жанраў пэўнага стылю вучні засвойваюць як пад час аналізу маўленчых узораў, так і са спецыяльных паведамленняў настаўніка. Вывучэнне маўленчых звестак не можа быць самамэтай, іх засваенне адбываецца на аснове аналітыка-сінтэтычнай маўленчай дзейнасці і носіць практыка-арыентаваны характар, у працэсе чаго адбываецца фарміраванне наступных маўленча-камунікатыўных уменняў:

- вызначаць камунікатыўную задачу выказвання і суадносіць з пэўным жанрам маўлення;
- вызначаць прыметы тэксту пэўнага жанру ў залежнасці ад маўленчай сітуацыі;
- вызначаць асаблівасці зместу тэксту пэўнага жанру;

Рэпазіторый ВДУ

- захоўваць кампазіцыю тэксту пэўнага жанру з улікам яго будовы;
- характарызаваць кампазіцыю тэксту;
- характарызаваць моўныя сродкі, якія выяўляюць жанрава-стылістычныя асаблівасці тэксту;
- захоўваць лагічную паслядоўнасць частак тэкступэўнага жанру;
- правільна інтанаваць выказванні ў залежнасці ад мэты маўлення;
- выкарыстоўваць сродкі адрасацыі маўлення ў тэкстах розных жанравай арганізацыі.

Пры аналізе жанравых асаблівасцей тэкстаў Г.І. Нікалаенка прапануе прытрымлівацца наступнай метадычнай схемы:"маўленчая сітуацыя, змястоўныя, кампазіцыйныя і лінгвастылістычныя асаблівасці" [2, с.29]. Таму сістэма камунікатыўна-маўленчых практыкаванняў распрацоўваецца на аснове наступных заданняў:

- апісаць маўленчую сітуацыю (месца, час, працягласць);
- раскрыць характар маўленчай сітуацыі і задачу моўных зносін (паведамленне, уздзеянне, гутарка);
- прааналізаваць моўныя асаблівасці афіцыйнага ці неафіцыйнага маўлення ў залежнасці ад характару суразмоўніцтва (афіцыйнае/неафіцыйнае, кантактнае/ дыстантнае, непасрэднае/ апасродкаванае);
- ахарактарызаваць асаблівасці выказванняў адносна ролевых адносін суразмоўцаў;
- вызначыць жанравыя характарыстыкі сітуацыі маўлення, якая апісана ў тэксце;
- вызначыць адпаведнасць моўных сродкаў абставінам і адрасату;
- апісаць папярэднія падзеі (да пачатку суразмоўніцтва).

Практыкаванні на замацаванне павінны насіць сітуацыйны характар, утрымліваць камунікатыўны каментарый і падводзіць вучняў да стварэння такіх выказванняў, якія непасрэдна функцыянуюць у рэальных зносінах. Напрыклад, тэксты *sms-паведамленняў* ці *бытавых запісак* запатрабаваны ў неафіцыйнай сферы маўлення. Вучням прапануецца практыкаванне на асэнсаванне сітуацыі, дзе ў цэнтры ўвагі знаходзіцца пэўны факт, прычына, якую неабходна выкласці лаканічна і дакладна:

1. *Пасля школы па дарозе дадому мама папрасіла зайсці ў магазін. Аднак у школе ты вымушаны затрымацца. Напішы маме sms-паведамленне, у якім ты патлумачыш прычыну таго, што не можаш выканаць яе просьбу*.
2. *Бабуля папрасіла цябе схадзіць на пошту. У цябе ёсць час, каб выканаць просьбу, але да цябе павінен зайсці сябар, з якім вы дамовіліся пра сустрэчу. Напішы да бабулі запіску, у якой патлумачыш прычыну таго, што выканаеш яе просьбу пазней. Карыстайся формуламі маўленчага этыкету.*

Адносна камунікатыўнай мэты тэксты *sms-паведамленняў* ўтрымліваюць *адмову* як маўленчае дзеянне. Вызначаецца, што пачатак тэксту – зварот – павінен прыцягнуць ўвагу, і разам з тым ён з'яўляецца сродкам выражэння пачуццяў да адрасата. Асаблівасцю такога жанру з'яўляецца ўжыванне ў выказваннях няпоўных і неразвітых сказаў, бо недахоп інфармацыі кампенсуецца за кошт зместу самой сітуацыі маўлення. Размеркаванне аргументаў па ступені важнасці забяспечвае сэнсавую цэласнасць тэксту, стварае магчымасць лагічна выразіць задуму аўтара, перадаць яго камунікатыўны намер. Пры *адмове* варта падумаць пра тое, як зрабіць гэта тактоўна, каб не пакрыўдзіць чалавека (*прабач, калі ласка..., як толькі вызвалюся, так адразу ж выканаю просьбу....).* Зварот да адрасата ў заключэнні выражае завершанасць тэксту, якая праяўляецца на сэнсавым узроўні.

Важна давесці вучням, што пры змене сітуацыі маўлення з афіцыйнай на неафіцыйную ці наадварот – тэксты некаторых жанраў (*запрашэнне, віншаванне, ліст, тэлеграма* і інш.) нават пры захаванні тэмы патрабуюць іншага моўнага афармлення. Напрыклад, пры разглядзе *запрашэння* ў камунікатыўным каментарыі варта паведаміць, што выказванне ўключае зварот да асобы, указанне прычыны ці падзеі, якая адбудзецца, пераканальную просьбу з'явіцца на ўрачыстасць. Разам з тым разглядаюцца спосабы выражэння камунікатыўнага намеру пры запрашэнні – выкарыстанне развітых звароткаў, ужыванне вобразных сродкаў і сродкаў эмацыйнага ўздзеяння. Засяроджваецца ўвага на эмацыйнай афарбоўцы, якая надаецца звароткам, што дапамагае перадаць пачуццё радасці, павагі, захаплення і непасрэдна накіроўвае на вырашэнне задачы маўлення. Вучні даведваюцца, што існуюць афіцыйныя і неафіцыйныя запрашэнні. Заданне ўтрымлівае апісанне неафіцыйнай сітуацыі: *Уявіце, што набліжаецца адно з сямейных свят. Каб зрабіць сюрпрыз сваім блізкім, вы вырашылі скласці для ўсіх арыгінальныя запрашэнні. На аснове ўласных уяўленняў узнавіце сітуацыі суразмоўніцтва, калі вы звярталіся з запрашэннем да сваіх сяброў ці блізкіх людзей. Сплануйце свае маўленчыя паводзіны ў час запрашэння, арыентуючыся на вашых блізкіх і знаёмых людзей. Якія звароткі вы выкарыстаеце, каб вашы блізкія адчулі клопат і неабходнасць у іх прысутнасці? Каб вашы сябры пераканаліся, што вы вельмі хочаце іх бачыць у сябе ў гасцях? Аформіце запрашэнні так, каб тэксты былі жывымі, выразнымі, адпавядалі той урачыстай сітуацыі, якую вы сабе ўявілі.* Пры стварэнні выказвання вучні асэнсоўваюць сэнсава-эмацыйныя



Рэпазіторый ВДУ

магчымасці звароткаў, залежнасць іх ужывання і інтанавання ад камунікатыўнага намеру і мэты маўлення. Разам з гэтым вучні будуць засвойваць спосабы выражэння думкі ў адпаведнасці з мэтай, задачамі і ўмовамі зносін, правілы маўленчых паводзін і формулы маўленчага этыкету. Маўленчае майстэрства будзе прадэманстравана праз уменне знаходзіць і выбіраць найбольш дакладныя, стылістычна і сітуацыйна дарэчныя моўныя адзінкі.

Такім чынам, уменні ствараць тэксты розных жанраў, запатрабаваных у паўсядзённа-побытавых сітуацыях маўленчых зносін, з'яўляюцца надзвычай важнымі ў сістэме практыка-арыентаванага навучання беларускай мове. Пры засваенні маўленчых паняццяў варта ўключаюць заданні, распрацаваныя з улікам складнікаў сітуацыі маўлення, што падвядзе да разумення залежнасці выніку маўленча-мысліцельнай дзейнасці суразмоўцаў ад іх камунікатыўнага намеру і сацыяльна-ролевай характарыстыкі. Пры стварэнні вучнямі ўласных выказвання ў розных жанраў неабходна засяроджваць увагу на сінтаксічным і структурным адзінстве тэксту, што дапаможа зразумець правілы кампазіцыйнай арганізацыі тэксту, прыёмы выражэння задумы. Чым больш асэнсавана будуць падыходзіць вучні да вывучэння маўленчай тэорыі, тым больш трывала будуць замацоўвацца не толькі маўленчыя веды, але і разнастайныя моўныя адзінкі, якія забяспечваюць уменне весці суразмоўніцтва па-беларуску.

**Літаратура**

1. Львова, С.И. Уроки словесности : 5 – 9 классы / С.И. Львова. – М.: Дрофа, 2001. – 411 с.
2. Николаенко, Г.И. Теоретико-методические основы обучения жанрам речи на уроках русского языка в средней школе / Г.И. Николаенко. – Минск : НИО, 2001. – 271 с.
3. Реферовская, Е.А. Коммуникативная структура текста в лексико-грамматическом аспекте / Е.А . Реферовская. – Л.: Наука, Ленингр. отд-ние. – 1989. – 166 с.

**S.V. Martynkevich**
Vitebsk State University named after P.M. Masherov
e-mail: svetlana_mrt@mail.ru

**The Study of Speechgenresin the Learning process of the Belarusian Language: Communicative Aspect of Activity**

*Keywords: communication skills, speech genres, styles of speech, speech situation, text.*

*The article describes the features of studying speech genres in the course of the Belarusian language at the institutions providing general secondary education.*

*A list of basic communication skills, tasks and examples of communicative exercises aimed at acquiring knowledge and skills to create texts of different speech genres are presented in the article.*

**А.Г. Мунтян**
Бельцкий Государственный Университет имени А. Руссо
anamunt@gmail.com

УДК 372.882

## ДИВЕРСИФИКАЦИЯ МЕТОДОВ ПРЕПОДАВАНИЯ ЛИТЕРАТУРЫ С УЧЕТОМ ТЕОРИИ МНОЖЕСТВЕННОГО ИНТЕЛЛЕКТА Г. ГАРДНЕРА

*Ключевые слова: предмет литературы, «жидкое современное общество», поколение Z, теория множественного интеллекта*

*Статья выявляет некоторые трудности в преподавании литературы как школьного предмета, которые вызваны, в частности, новой социально-технологической средой. Отсюда и новое поколение школьников и студентов, которые предпочитают компьютерные игры чтению книг. Автор считает, что ориентирование в практике преподавания на теорию множественного интеллекта Гарднера и принципы индивидуализации и плюрализации, от которых она отталкивается, поможет разработать эффективные стратегии преподавания литературы и воспитания вдумчивого читателя.*

Роль литературы в формировании ценностных опор личности неоспорима, также, как нельзя оспорить другие значимые влияния литературного воспитания, такие, как формирование личности, решение социальных проблем и конфликтов, нравственно-эстетическое развитие учащихся и др., Литература является одним из основных учебных предметов, который помогает развивать культурное осознание, улучшает языковые навыки, обогащает их воображение.

Филолог и писатель Людмила Сараскина в интервью для Российской Газеты, отметила что задача литературы состоит в формировании «самостоятельно мыслящего человека и творческого читателя». Кристофер Брумфит, автор работ по языку, литературе, преподаванию и языковой политики в



Репозиторий ВГУ